УДК 821.161.3 (092 Карамазаў)

У. М. Мыслівец

Навук. кір. – Т. А. Аляшкевіч, канд. філал. навук, дацэнт

# ПАЭТЫКА ЖАНРУ АПАВЯДАННЯ ВІКТАРА ФІЛІМОНАВІЧА КАРАМАЗАВА «ЖАНЧЫНА Ў ЧОРНЫМ І АФГАН»

Артыкул прысвечаны пытанням паэтыкі жанру апавядання В. Ф. Карамазава «Жанчына ў чорным і Афган». Мэта – акрэсліць і прааналізаваць адметныя рысы жанру названага апавядання. Навізна работы заключаецца ў тым, што, як правіла, у айчынным літаратуразнаўстве і крытыцы, творчасць В. Ф. Карамазава вывучаецца з пункту гледжання ідэйна-тэматычнай скіраванасці, а пытанні паэтыкі яго твораў застаюцца па-за ўвагай. Аналіз дазваляе зрабіць выснову, што апавяданне В. Ф. Карамазава ўтрымлівае ў сабе структурны інварыянт, які дазваляе аднесці твор «Жанчына ў чорным і Афган» да жанру апавядання. Аднак гэты структурны інварыянт мае пэўнае вар�about іраванне, якое пацвярджае некананічны статус жанру апавядання, і праяўляецца ў збліжэнні яго з жанрам навелы.

Разгляд жанравай стратэгіі пісьменніка дазваляе адзначыць, што жанры малой і вялікай эпічнай формы па-рознаму распрацоўваліся аўтарам. Так, на пачатку свайго творчага шляху В. Ф. Карамазаў звярнуўся да жанру апавядання, якому застаўся верным і надалей. Пабачылі свет зборнікі апавяданняў і аповесцей «Падранак», «Па талым снезе», «Дома», «Галуба» і іншыя. Пасля апавяданне В. Ф. Карамазава добра суіснуе поруч з аповесцю, раманам, навелай і эсэ. Пры чым названыя жанры часам маюць аўтарскую інтэрпрэтацыю, што, да таго ж, з‟яўляецца і паказчыкам стылю пісьменніка, напрыклад, аповесць-эсэ ў стылі рэтра, раман-эсэ і аповесць-эсэ В. Ф. Карамазава пра знакамітых беларускіх і рускіх мастакоў. Альбо, напрыклад, твор «Крыж на зямлі і поўня ў небе» пазначаны як эскізы, эцюды і споведзь Духу. Аўтар сам прызнаецца: «А што такое аповесць-эсэ, як не разбурэнне традыцый жанравых канонаў?» [1, с. 83−84]. Усѐ гэта дае падставы меркаваць, што творы В. Ф. Карамазава валодаюць сваімі жанравымі адметнасцямі. Пастараемся прасачыць наяўнасць такіх адметнасцей ў жанры апавядання. 93 Мэта дадзенай працы – акрэсліць і прааналізаваць жанравыя рысы апавядання «Жанчына ў чорным і Афган» В. Ф. Карамазава. Пытанне наконт тэарэтычнага аспекту жанру апавядання не раз ставілася ў цэнтры ўвагі шматлікіх літаратуразнаўцаў, якія спрабуюць знайсці сутнаснае ядро названага жанру, яго спецыфічныя асаблівасці, вылучыць, чым гэты жанр адрозніваецца ад іншай малой эпічнай формы – навелы, а таксама, што дае падставы не атаясамліваць яго з аповесцю. Калі звярнуцца да хрэстаматыйных падручнікаў, літаратуразнаўчых слоўнікаў, то можна знайсці наступнае азначэнне жанру апавядання: «Апавяданне – невялікі празаічны твор, сюжэт якога грунтуецца на пэўным (рэдка некалькіх) эпізодзе з жыцця аднаго (часам некалькіх) персанажа» [2, с. 332]. Невялікія памеры апавядання патрабуюць неразгалінаванага, як правіла, адналінейнага, выразнага па будове сюжэту. Характары паказваюцца пераважна ў сфарміраваным выглядзе. Апісанняў мала, яны кароткія, лаканічныя. Важную ролю ў апавяданні адыгрывае мастацкая дэталь (дэталь побыту, псіхалагічная дэталь і інш.). Свой погляд на прыроду апавядання і яго спецыфіку выказвае беларускі літаратуразнаўца В. П. Рагойша. Ён лічыць, што «апавяданне – адносна невялікі апавядальны твор, у якім расказваецца пра нейкі адзін вызначальны выпадак (сітуацыю, падзею) з жыцця чалавека. У апавяданні адна сюжэтная лінія, абмежаваная колькасць дзейных асоб, характары якіх дастаткова сфарміраваныя» [3, с. 303]. Характэрныя асаблівасці – наяўнасць апавядальніка, вядзенне аповеду (ад асобы аўтара ці героя-апавядальніка) больш пра паўсядзѐннае жыццѐ, бытавыя ўзаемаадносіны паміж людзьмі ў храналагічнай паслядоўнасці. Н. Д. Тамарчанка ў акадэмічным дапаможніку «Тэорыя літаратуры» (2004) прапануе вылучыць адметныя рысы апавядання праз яго супастаўленне з больш буйнымі жанрамі, напрыклад, з раманам і аповесцюі і адначасова адасобіць яго ад блізкага яму жанра навелы. Так, даследчык не

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

схільны лічыць маленькі аб�'‘ём апавядання яго адрознай ад аповесці прыкметай. Ён даводзіць, што часам такое бачанне з‘‘яўляецца ілюзорным. Адпаведна даследчык прапаноўвае ўлічваць два аспекты: прадметны (што выяўлена: падзея, прастора і час, у якім яна адбываецца) і план «суб‘‘ектны» (хто выяўляе падзею і па сродках якіх форм маўлення)» [4, с. 401]. Параўноўваючы апавяданне і аповесць заўважаем, што, акрамя аб‘‘ёму, «аповесць адрозніваецца ад апавядання разгорнутым сюжэтам, вялікай колькасцю другасных персанажаў, больш поўнай і глыбейшай іх характарыстыкай, наяўнасцю апісанняў» [2, с. 335]. Литературоведение 94 Звернемся непасрэдна да твораў В. Ф. Карамазава, найперш да апавядання «Жанчына ў чорным і Афган». Першая заканамернасць, якая павінна прасочвацца ў апавяданні, – адзінства часу. Мастацкі час у апавяданні лінейны, падзеі падаюцца ў храналагічным парадку, аднак кампазіцыйна твор пабудавана так, што праз пэўны адрэзак мастацкага часу (сѐння, на другі дзень, праз тыдзень) той самы рынак і героі зноў і зноў трапляюць у поле зроку апавядальніка і адпаведна чытача. Час рухаецца па крузе, кожны дзень гераіні такі самы, амаль не адрозніваецца ад іншых. Аднак мастацкія дэталі, што маюць месца ў творы, даюць іншае ўяўленне пра час, які ўмяшчаецца ў творы. Прышоўшы ў хату да жанчыны, Алег заўважыў, што з таго моманту, калі ѐн тут быў «у тым годзе», нічога не змянілася, нават кветкі стаялі тыя самыя. Мастацкі час у апавяданні расцягваецца: можна ўявіць, што такія паходы на рынак жанчыны з сабакам доўжацца даволі даўно. І, на жаль, з кожным днѐм нічога не мяняецца. Жыццѐ жанчыны, быццам бы «завісла» на гэтай падзеі. Наступная акалічнасць апавядання – адзінства месца дзеяння і адзінства падзейнае. У апавяданні можна вылучыць дзве асноўныя падзеі. Першая – паход жанчыны з сабакам на рынак, другая – сустрэча жанчыны з Алегам, сябрам яе сына. Названыя падзеі акрэсліваюцца ў двух асноўных топасах – кватэра і рынак, а паміж імі дарога. Кватэра і рынак (адзіная прастора для існавання жанчыны, якая пасля гібелі сына амаль цалкам адрэзана ад наваколля, «тут, у кватэры, свае перажыванні, тое, што робіцца там, за акном, не можа не ўплываць на тое, што адбываецца тут, хоць тут як быццам нічога не адбываецца» [5, с. 340]) выступаюць супрацьлеглымі палюсамі, пры чым ні адзін з іх не дае суцяшэння галоўнай гераіні: з аднаго боку, яна прагне прадаць сабаку, з другога – усімі сваімі рухамі, усѐй сваѐй сутнасцю імкнецца захаваць сабаку, пакінуць разам з сабой. Дарога, з кватэры да рынку і наадварот, дорыць надзею на суцяшэнне. Месца дзеяння апавядання толькі на першы погляд абстрактнае: звычайны дом, кватэра, непрыкметныя вуліцы, рынак. Далей у тэксце падаецца канкрэтная геаграфічная прывязка: «Тым часам Афган і жанчына ў чорным мінаюць возера і завулкам падымаюцца да Старавіленскага рынку» [5, с. 334]. Старавіленскі рынак знаходзіўся раней у Мінску і пісьменнік добра ведаў гэта месца. Аднак прастора ў апавяданні таксама мае тэндэнцыю да пашырэння, што дасягаецца праз аповед-успаміны аднаго з герояў. Так, Алег, сябра загінуўшага сына жанчыны, распавядае ѐй пра Кабул, пра тое, як усѐ 95 здарылася ў той апошні дзень, калі яны павінны былі вяртацца дамоў, да сваіх родных. Наступная рыса, якая пацвярджае жанравы статус дадзенага твора як апавядання, – адзінства цэнтру, у якасці якога ў названым творы і выступае галоўная гераіня ці, дакладней, два героі – жанчына ў чорным і яе сабака. Яны выступаць як адзіны вобраз, непадзельны, узаемадапаўняльны, што не раз падкрэсліваецца і зместам самога твора: «Ідуць нетаропка, маўкліва, быццам з адной думкаю на дваіх, баючыся яе згубіць» [5, с. 334]. В. Ф. Карамазаў мяняе планы апавядання, чытач бачыць падзеі і герояў то панарамна вачыма самаго апавядальніка, то дэталѐва праз успрыманне дзейных асоб – Babakі, Алежкі, эпізадычных герояў, то чуваць голас самога аўтара, дальні план чаргуецца з бліжнім. Напрыклад, «яны, сабака і жанчына – не пабаімся паставіць іх побач і ў нашым аднолькава спагадлівым да абаіх радку, – падобныя і бездакорна чорным колерам сваіх вопратак, і настроем, і нечым яшчэ – большым» [5, с. 334]. Тут яўна пераважае голас аўтара (аўтарская свядомасць) над аб‘‘ектыўным аповедам. Выкарыстаная форма дзеяслова другой асобы множнага ліку – не пабаімся –дакладна акрэслівае стаўленне аўтара да герояў апавядання – адносіцца да іх з вялікай павагай («у нашым аднолькава спагадлівым да абаіх радку»). Альбо ў наступным урыўку: «Ад рашучага мужчынскага голасу яна губляецца, быццам яго, гэтага голасу, больш за ўсѐ баялася. Што адказаць? Што рабіць? Яна прысядае, абедзвюма рукамі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

абдымае сабаку, туліць да сябе, насовачкай выцірае лапы, грэючы іх, кожную, у далонях, чуючы, як яны замерзлі ад мокрага і халоднага ранішняга асфальту» [5, с. 336]. У пытаннях – Што адказаць? Што рабіць? – чуваць голас самой галоўнай гераіні. Кульмінацыйнай сцэнай ў апавяданні з‟яўляецца сустрэча з «прыгожым маладым мужчынам», сябрам яе сына. Ён не суцяшаў жанчыну, бо ведаў яе бяду і ведаў, што суцешыць яе немагчыма, што ѐй проста трэба выплакацца. Чакаў, калі сама супакоіцца. Дадзенае апавяданне ў жанравых адносінах не зусім характэрнае. Па разгортванні сюжэта яно хутчэй нагадвае навелу, у якой прысутнічае так званы, характэрны менавіта навеле пуант. Сюжэт апавядання – кумулятыўны, прадугледжвае нанізванне адну на адну аднародныя падзеі і тым самым «стварае інерцыю набліжэння нарастаючых аднародных падзей да сваѐй мяжы» [6, с. 199]. «Сюжэтная структура асіметрычная: сыходная лінія невымерна карацей за ўзыходзячую, а адна фінальная падзея па сваѐй значнасці роўная ўсяму папярэдняму ланцугу падзей» [4, с. 389]. Ён не пытаў ў яе нічога, бо ведаў, што адказваць на іх яна не Литературоведение 96 зможа, няма сілы, але адно ѐн у яе ўсѐ ж такі спытаў: «Навошта прадаяце Афгана?» [5, с. 336]. Жанчына сабрала ў сабе ўсю моц і слѐзы, каб хоць што-небудзь адказаць. «І прадаць не магу, і жыць не магу з Афганам. І што мне з ім рабіць?.. Ён усѐ памятае. Сваю зямлю, сваѐ неба, свае горы. Сярожу. Ён кожную ноч сядзіць перад акном і вые. Усю ночачку да раніцы. А я не магу слухаць, як ѐн вые. Не магу ні спаць, ні ляжаць. Я змаглася жыць з ім. Ён дастае з мяне душу сваім выццѐм. Сам пакутуе і мне жыць не дае» [5, с. 337]. Прааналізаваўшы жанравыя асаблівасці апавядання «Жанчына ў чорным і Афган», мы прыйшлі да наступных высноў: 1 жанравая стратэгія аўтара абумоўлена найперш пошукамі патрэбнай формы для адлюстравання мастацкага свету ў творы; 2 апавяданне В. Ф. Карамазава ўтрымлівае ў сабе структурны інварыянт, які дазваляе аднесці твор «Жанчына ў чорным і Афган» да жанру апавядання. Аднак гэты структурны інварыянт мае пэўнае вар‟іраванне, якое пацвярджае некананічны статус жанру апавядання, і тым самым збліжае яго з жанрам навелы; 3 з аднаго боку, у дадзеным апавяданні захоўваюцца ўсе складнікі апавядання – адзінства часу і месца, адзінства дзеяння і падзейнае адзінства, адзінства персанажа як асноўнага цэнтра твора. Сапраўды, асноўныя падзеі разгортваюцца менавіта ў кватэры і на рынку – асноўных топасах апавядання. У творы прысутнічаюць дзве асноўныя сэнсаствaральныя падзеі – паход на рынак і сустрэча жанчыны з Алегам. Аднак хранатоп у апавяданні пашыраецца за кошт такой сюжэтнай падзеі, як успамін героя пра ваенныя падзеі ў Кабуле. Да таго ж, немалаважнай мастацкай дэталлю ў творы выступае безыменнасць гераіні і, наадварот, вельмі гаваркое імя сабакі – Афган. Аўтар не называе імя жанчыны і тым самым выводзіць асноўную праблему і ідэю твора («Каму спатрэбілася тая вайна»? [5, с. 337]) за межы гэтай жанчыны, яе асабістага лѐсу, пашыраючы і надаючы ѐй сусветны маштаб. З другога боку, наяўнасць пуанту, своеасаблівай катарсічнай сюжэтнай кропкі, збліжае апавяданне В. Ф. Карамазава з навелай.

Спіс літаратуры 1 Карамазаў, В. Ф. Крыж на зямлі і поўня ў небе: эскізы, эцюды і споведзь Духу, альбо Аповесць-эсэ жыцця жывапісца і паляўнічага Бялыніцкага-Бірулі: для ст. шк. узросту / В. Ф. Карамазаў. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – 216 с. 97 2 Грам‟яка, Р. Т. Літаратуразнаўчы слоўнік-даведнік / Р. Т. Грам‟яка, Ю. І. Ковалѐва, В. І. Цярэмка. – К. : ВЦ «Академія», 2007. – 480 с. 3 Рагойша, В. П. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў / В. П. Рагойша. – Мінск : Нар. Асвета, 2009. – 303 с. 4 Теория литературы: учеб. пособие для студ. филол. фак. высш. учеб. заведений: в 2 т. / под ред. Н. Д. Тамарченко. – М. : Издательский центр «Академия», 2004. – Т. 1: Теория художественного дискурса. Теоретическая поэтика. – 512 с. 5 Карамазаў, В. Ф. Аброчны крыж: Аповесці, апавяданні / В. Ф. Карамазаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – 382 с. 6 Поэтика: словарь актуальных терминов и понятий / гл. науч. ред. Н. Д. Тамарченко. – М. : Издательство Кулагиной; Intrada, 2008. – 358 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ